УДК 39:677.024.39(476)

# ВОБРАЗ МАЦІ
# У БЕЛАРУСКІМ МАСТАЦКІМ ТКАЦТВЕ

**Хартановіч Д. С.**
Установа адукацыі "Магілеўскі дзяржаўны
універсітэт імя А. А. Куляшова"
(г. Магілёў, Рэспубліка Беларусь)
Навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт
А. С. Мельнікава

Анатацыя. Мастацтва ткацтва ў Беларусі мае глыбокія традыцыі, якое адлюстроўвае культурныя, абрадавыя і сямейныя традыцыі. Вобраз маці займае цэнтральнае месца ў народнай творчасці сімвалізуючы сувязь пакаленняў і ўрадлівасць. Мэтай працы з'яўляецца раскрыць і прааналізаваць асаблівасці ўвасаблення вобраза маці ў традыцыйным беларускім ткацтве ў працэсе вывучэння сімволікі арнаментаў і сюжэтаў звязаных з мацярынствам у тканых вырабах.
Ключавыя словы: беларускае ткацтва, вобраз маці, арнамент, сімвалізм, этнаграфія.
Summary. The art of weaving in Belarus has deep traditions that reflect cultural, ceremonial and family traditions. The image of the mother occupies a central place in folk art, symbolizing the connection of generations and fertility. The purpose of the work is to reveal and analyze the features of the embodiment of the mother's image in traditional Belarusian weaving in the process of studying the symbolism of ornaments and subjects related to motherhood in woven products.
Key words. Belarusian weaving, mother's image, ornament, symbolism, ethnography.

Народнае мастяцкае ткацтва – адзін з найбольш пашыраных і вядомых відаў народнага мастацтва. Арнамент адлюстроўвае усе тое, чым жылі і жывуць па сённешні дзень беларусы. Сёння мы звыкла ацэньваім тканыя рэчы з погляду прагажосці, але калі глядзець у глыбіню гэтай прамысловаці мы бачым бяздонную крыніцу культурна-гістарычных звестак – кожны узор штосці та адзначае. Вось напрыклад: Сімвалы ураджаю: Спарш, Багач, Рай, якія дапамагаюсь ўбачыць у беларусаў любоў да працы, вучуць любіць Маці-Зямлю.Сімвал; Таксама прысутнічаюць сімвалы розных язычніцкіх святаў: Купала, Каляда, Вялікдзень, якія дапамагаюць зразумець якім чынам беларусы выказвалі гонар за вынікі сялянскай працы; Шырока выкарыстоўваліся таксама сімвалы роду: Дзяды, Радуніца, якія выказвалі павагу да сваіх продкаў. Усе тое, аб чым нам паведамляе народнае ткацтва пералічыць тяжка, але кожны ўзор сімвалізуе дабро, счасця, павагу.

Часам можна пачуць пытанні: "Што можа разумець і сказаць творчасць цемных, і не адукаваных сялянак, якія рабілі гэтыя прыгожыя вырабы?". Але, калі сёння адукаваныя людзі задаюці падобныя пытанні адразу з'яўляецца добры адказ "Неадукаванасць гэтых жанчын не рабіла іх цёмнымі людзмі, а вось ты – цёмны, калі не бачыш усё тое, што яны закладалі у гэтыя, духоўныя, малюнкі". Галоўнае, што нам трэба зразумець, так гэта тое, што нам сёння цяжка зразумець тую адзінасці людзей і прыроды, тое тонкае адчуванне раслінныга і жывелага свету – тут нам далёка да нашых продкаў.

У народным мастацкім ткацтве вельмі шмат узораў падобных па характары і малюнку, таму іх часта блытаюць. Напраклад узор "зорка", якая пакладзена ў аснову возраза маці, чалавека і сімвалу ураджаю. Вобраз маці – зорка, якая абрамляецца пышным вянком і гірляндай кветак, аблямоўка можа быць квадратнай ці васьмівугольнай. (гл. іл. 1). Вобраз чалавека – таксама зорка, але аблямоўка чатырохвугольная больш прасцейшая, ланцужковая (іл. 2) [2, с. 11].



**Ілюстрацыя 1**. Фрагмент пасцілкі с матывам маці.
Ваўкавыскі р-н Гродзенскай вобл.



**Ілюстрацыя 2.** Посцілка з
услаўленнем чалавека-працаўніка.
Полацкі р-н, Віцебская вобл.

У тканым і вышываным арнаментах вобраз Маці сустракаецца у трох варыянтах: у выглядзе жаночай фігуры (іл. 3), абрамаванай гірляндаю зорак (іл. 4) і схематычна вырашанага дрэва (дрэва жыцця, іл. 5). Нярэдка вобраз суправаджаецца сімваламі сонца, месяца, агню, ветру, чем майстрыхі падкрэслівалі раўназначнасць вобразаў [2, с. 45].

Вобраз Маці як сімвал любві і міласэрнасці ў дэкоры тканых і вышываных вырабаў вельмі часты. За яго асновы бярэца васьміканцовпя зорка, што адзначае чалавека, асобу, аблямоўвае яе гірлянда кветак, што падкрэслівпе веліч маці, яе асабліваю ролю і прываджнасці жыцця (іл. 1) [2, с. 48].



**Ілюстрацыя 3**. Фрагмент дэкору посцілкі з сімвалам Маці.



**Ілюстрацыя 5.** Вобраз Маці
ў выглядзе дрэва жыцця.



**Ілюстрацыя 4.** Ручнік
Мар' іна Горка Мінская вобл.

Найвышэйшае ўвасабленне любві, дабрыні і чысціні – маці і дзіця, гэта вобразы да якіх не маглі не зварачвацца беларускія ткачыхі і вышывальніцы. Аснову сімвала Маці складае зорка, а вось на рушніку з горада Ліда адлюстраваны сімвал дзіцяці, як казала сама аўтарка сімвалу яна у гэтым ручніку хацела выказаць сваю любоў да немаўлятка, кое прынесла у яе жыцце шчасця (іл. 6) [2, с. 54].

Акрамя маці-жанчны ў народным ткацтве пашыраны вобраз маці-Вялікай багіні Маці-Зямлі. Варыянты узору: багіня Маці-Зямля ў зорках (на небе), багіня Маці-Зямля ў сонцы (з сонцам), і багіня Маці-Зямля-Карміцелька (Ніва). Майстрыхі прыдумалі, як проста і даступна адлюстраваць зближэнне сонца і зямлі у выніку



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

чаго абуджаецца прырода. Сонца яны адлюстроўвалі ромбам з прамянямі-адросткамі, а багіне Маці-Зямля адлюстроўваецца таксама ромбам але с адросткамі ўнутар. Каб паказаць яднанне сонца і зямлі, сімвал сонца змяшчаецца ўнутар сімвала зямлі (іл. 7).

Вобраз Берагіні – адзін з самых найстаражытных у пантэоне славянскіх багоў, які выяўляе даўнія народныя імкненні забяспечыць шчаслівую і здаровую сям'ю. Паводле павер'яў, Берагіня вясною клапоціцца, каб жанчына-сялянка не галадала, летам каб не захварэла ад цяжкай працы, восенню дапамагае ёй пры родах, а зімой абагравае яе і дзетак. Напрыклад, на ілюстрацыі 8 адлюстравана язычніцкае капішча ў гонар Берагіні, а маленькія ўзоры накшталт жучкоў называюцца абярэгамі [1, с. 62].



**Ілюстрацыя 6.** Сімвал дзіцяці.



**Ілюстрацыя 7.** Старадаўні ручнік з выявай Берагіні. Віцебская вобласць.



**Ілюстрацыя 8.** Яднанне сонца і зямлі.

Мастацтва ткацтва займае асаблівае месца ў традыцыйнай культуры Беларусі, адлюстроўвае светапогляд, вераванні і эстэтычныя ідэалы народа. У традыцыйных узорах вобраз маці часта асацыюецца з: Багіняй-маці (сімвалам працягу роду, часта адлюстроўваўся ў выглядзе стылізаваных жаночых фігур або дрэва жыцця) і захавальніцай хатняга ачага. Ўвасабленне ладу ў арнаментах з' ўляюцца геаметрычныя матывы (ромбы, крыжы, зігзагі) і раслінныя ўзоры (дрэва жыцця, кветкі, каласы). Сёння традыцыйныя матывы, звязаныя з мацярынствам, выкарыстоўваюцца ў: дэкаратыўна-прыкладным мастацтве (аўтарскія габелены, сучасная вышыўка), этнадызайне (упрыгожванне інтэр'ераў у нацыянальным стылі).

Вобраз маці ў беларускім ткацтве – гэта глыбокі сімвал, які злучае ў сабе архаічныя вераванні, народную мудрасць і эстэтыку. Праз арнаменты і абрадавыя тканіны перадаваліся ідэі працягу роду, абароны і гармоніі. Сёння гэтыя традыцыі застаюцца актуальнымі, захоўваючы сувязь паміж мінулым і сучаснасцю.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

### Спіс выкарастанай літаратуры

1. Галенчик, Н. И. Орнаментальные мотивы белорусской вышивки / Н. И. Галенчик // Народное искусство: традиции и современность : сб. науч. тр. / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора ; редкол.: Т. А. Новогродский (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 2016. – С. 56–72.
2. Кацар, М. С. Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка / М. С. Кацар ; навук. рэд. Я. М. Сахута ; [пераклад з рускай мовы, літаратурная апрацоўка і навуковая рэдакцыя Я. М. Сахуты]. – Мінск : Беларус. энцыкл. імя Пятруся Броўкі, 1996. – 208 с.
3. Лакотка, А. И. Символика белорусского народного орнамента / А. И. Лакотка. – Минск : Беларус. навука, 2018. – 320 с.